

KIRKMAN • ADLARD • RATHBURN

THE WALKING DEAD

image

8 MAY $2.95 $3.95 CAN



BY COMICS

ХАДЗЯЧЫЯ МЕРЦВЯКІ
#8 (2003)


ЦЯЖАРНА?
ЯК ДАЎНО?


НЯ ВЕДАЮ... ТЫДЗЕНЬ... МОЖА ДВА... МОЙ ЦЫКЛ ЗБІЎСЯ, КАЛІ ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ. Я ДУМАЮ, З-ЗА СТРЭСАЎ.


ТЫ ЎПЭЎНЕНА?


УПЭЎНЕНА. Я ВЕДАЮ ДАКЛАДНА, ШТО АДЧУВАЕШ У ТАКІХ ВЫПАДКАХ. НЯМА СУМНЕВАЎ...
Я ЦЯЖАРНА.


ШТО БУДЗЕМ РАБІЦЬ?
НЯ ВЕДАЮ.


Я ЦЯБЕ ХАЦЕЛА СПЫТАЦЬ.


УСЁ Ў ПАРАДКУ?


Я ЦЯЖАРНА.
ПРОСТА ХАЦЕЛА СКАЗАЦЬ РЫКУ СПАЧАТКУ.


У НАС БУДЗЕ ДЗІЦЯ.




ЭЭЭ... УАЎ. Я ПРОСТА... Я НЯ ВЕДАЮ, ШТО СКАЗАЦЬ.


ГАДАМІ СПРАЦОЎВАЛА "ВІНШУЮ".


ПРАБАЧ, РЫК... Я ПРОСТА ХВАЛЮЮСЯ. У НАС НЯМА ДАКТАРОЎ, НЯМА ШПІТАЛЯЎ. ШТО ВЫ БУДЗЕЦЕ РАБІЦЬ?


ПЕРАСЯЧЭМ МОСТ, КАЛІ ПАДОЙДЗЕМ ДА ЯГО.
УСЁ БУДЗЕ ДОБРА, АЛЕН. ГЭТА ДОБРЫЯ НАВІНЫ.


ВО ХАЛЕРА, ЗНОЎ СНЕГ ПАЙШОЎ. МЫ ДАСТАТКОВА ВАДЫ НАКІПЯЦІЛІ, КАБ ПАПОЎНІЦЬ БУТЭЛЬКІ?
ДАРЭЧЫ, ДОБРА Б БЫЛО, КАБ МЫ ЗНАЙШЛІ ГЭТУЮ РЭЧКУ.


РЫК, ПАМЯТАЕШ, МЫ НЕЯК С ТАБОЙ РАЗМАЎЛЯЛІ... ШЭЙН І ЛОРЫ... ТЫ НЕ ДУМАЕШ?..


СЛУХАЙ, ДЭЙЛ, ПРОСТА СПЫНІСЯ, ДОБРА?


ПРОСТА ТЫ З НАМІ КРЫХУ БОЛЬШ МЕСЯЦА. ТАМУ МОЖА БЫЦЬ...




БОЛЬШ НІ СЛОВА, ДЕЙЛ! НІ ВОДНАГА КЛЯТАГА СЛОВА!
Я ВЕДАЮ ДАКЛАДНА, ШТО ТЫ ХОЧАШ СКАЗАЦЬ. ТЫ ДУМАЕШ, Я ПРА ГЭТА НЕ ДУМАЎ? ГЭТА ЎСЁ, ПРА ШТО Я ДУМАЮ. СЭКС У НАС БЫЎ АДЗІН РАЗ, КАЛІ Я ВЯРНУЎСЯ... Я СЫХОДЖУ З РОЗУМУ АД ГЭТАГА. АЛЕ Я ВЕРУ МАЁЙ ЖОНЦЫ, І ГЭТА ЎСЁ, ШТО Я МАГУ ЗРАБІЦЬ.
Я СПРАБУЮ НЕ ДУМАЦЬ ПРА ГЭТА. КАЛІ Я ПРАЦЯГНУ, ТО З ГУСТУ З'ЕДУ.
Я ХВАЛЮЮСЯ ТАК ЖА, ЯК І АЛЕН. ГЭТА МОЖА ЗАБІЦЬ ЛОРЫ... І Я... НЕШТА ІНШАЕ МОЖА ЗАБІЦЬ МЯНЕ.
Я ПРОСТА НЕ ЗМАГУ ЗЛАДЗІЦЬ З ГЭТЫМ ЗАРАЗ.


РЫК, Я... ПРАБАЧ, ШТО Я ПАЧАЎ ГЭТУЮ РАЗМОВУ.


НЕ ТУРБУЙСЯ, СЫНОК, УСЁ БУДЗЕ ДОБРА. ТЫ ПЕРАЖЫЎ ШМАТ ЧАГО НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ СТРАЦІЦЬ УСЁ ЗАРАЗ.
АСАБЛІВА, КАЛІ Ў ЦЯБЕ БУДЗЕ ЯШЧЭ ДЗІЦЁ.


ДОБРА... ПОЙДЗЕМ ПАСПІМ.







ГЭТА МЕСЦА МОЖА НАМ ПАДЫЙСЦІ.
ЛАЙНО.


ПАЕХАЛІ.
ДЛЯ НАС ТУТ НІЧОГА ЦІКАВАГА НЯМА.









О БОЖА!
О БОЖА!
О БОЖА!
О БОЖА!
ДЭЙЛ!


Я... Я ПРОСТА ШПАЦЫРАВАЎ. Я НАВАТ НЕ ЎБАЧЫЎ ЯГО. ПРАБАЧЦЕ, ШТО НАПУЖАЎ.
БОЖА МОЙ, ДЭЙЛ! ТЫ Ў ПАРАДКУ?! ЁН НЕ ПАРАНІЎ ЦЯБЕ? ТЫ Ў ПАРАДКУ?!
Я Ў ПАРАДКУ, АНДРЭА. Я ПРОСТА ПАДАЮ КУЛЁМ. Я Б ХАЦЕЎ ПРОСТА БЫЦЬ У ПАРАДКУ.
ШТО ТУТ?
ВОСЬ Д'ЯБАЛ.
ЁН МЁРТВЫ?

Я ЛІЧУ, ЁН ЗАМЁРЗ.

АГГ.
АААА!

АГА. ВОСЬ, ШТО С ТАБОЮ ЗДАРЫЛАСЯ?
ТАК, ТОЛЬКІ ГЛЯДЗЕЦЬ СМЯШНЕЙ І НЕ ТАК БАЛЮЧА.

KROK!

НАПЭЎНА, У ІХ НЯМА ЦЫРКУЛЯЦЫІ КРЫВІ... ТАМУ ЯНЫ ЗАМЯРЗАЮЦЬ ХУТЧЭЙ ЗА НАС.
І ГЭТА ДОБРА.
МЫ Ў БЯСБЕЦЫ, ПАКУЛЬ ТРЫМАЕЦЦА ТАКОЕ НАДВОР'Е.

А ГРУШАЎ У КАНСЕРВАХ НЕ ЗАСТАЛОСЯ?
КАЛІ АПОШНІ РАЗ ПРАВЯРАЛА, НЕ БАЧЫЛА НІ ВОДНАЙ. ЗАСТАЛОСЯ ЯШЧЭ ТРЫ З ПЕРСІКАМІ. КАЛІ ЯНЫ КОНЧАЦЦА, МЫ ЗАСТАНЕМСЯ БЕЗ САДАВІНЫ.
ХАЛЕРА... Я ВЕЛЬМІ ЛЮБЛЮ ГРУШЫ. І НЕНАВІДЖУ ПЕРСІКІ.
ТЫ ХВАЛЮЕШСЯ?
Я МАЮ НА ЎВАЗЕ - ЗА ДЗІЦЯ.
ТАК, КАНЕШНЕ. У СЭНСЕ... ЛЮДЗІ СТАГОДДЗЯМІ НАРАДЖАЛІ БЕЗ ДАПАМОГІ, АЛЕ АД ГЭТАГА МНЕ НЕ СТАНОВІЦЦА ЛЯГЧЭЙ.
І МЫ НЕ МОЖАМ ПРАВЕРЫЦЬ, ЦІ ЎСЁ БУДЗЕ Ў ПАРАДКУ, І ЦІ НЕ БУДЗЕ ПРАБЛЕМ ПОТЫМ. У МЯНЕ МОГУЦЬ БЫЦЬ БЛІЗНЯТЫ, А МЫ НАВАТ ГЭТАГА НЕ ВЕДАЕМ.
І МОРФІЙ... У НАС НЯМА МОРФІЮ.
ЛАЙНО! ПРА ГЭТА Я НАВАТ НЕ ПАДУМАЛА.
АЙ, МАМ! ТЫ СКАЗАЛА ДРЭННАЕ СЛОВА! ТЫ ПАВІННА МНЕ ЧАЦВЯРТАК!
ХІ-ХІ!
О, КАРЛ! ЗАПІШЫ НА МОЙ РАХУНАК.
ВУНЬ ТАМ! СПЫНІСЯ!
Я БАЧУ!


WILTSHIRE ESTATES
Я ЛІЧУ, МЫ ВЫЙГРАЛІ ДЖЭКПОТ!


МЫ НЕ МЕНШ ЯК НА ДВЕСЦЕ МІЛЬ АД ГОРАДА... ТУТ МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ У БЯСПЕЦЫ.
БОЖА. КАЛІ Б СНЕГ НЕ ПЕРАСТАЎ ГАДЗІНУ НАЗАД, МЫ Б ПРАМІНУЛІ ГЭТАЕ МЕСЦА.


ГЭТАЕ МЕСЦА ІДЭАЛЬНА. МЫ МОЖАМ ПАЧАЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ТУТ.
ВЫГЛЯДАЕ ПЕРСПЕКТЫЎНА.
ДОБРА, ДАВАЙЦЕ АГЛЯДЗІМСЯ, АЛЕ НЕ РАЗЫХОДЗЬЦЕСЯ ДАЛЁКА АДЗІН АД АДНАГО. ПРОСТА ПРАВЕРЫМ НЕКАЛЬКІ БЛІЖЭЙШЫХ ХАТ. МЫ НЕ ВЕДАЕМ ЦІ САПРАЎДЫ ГЭТАЕ МЕСЦА ЗАКІНУТАЕ. І ХУТКА ПАВЕЧАРЭЕ, ТАКІМ ЧЫНАМ БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫ.


ХЛОПЧЫКІ, ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З КЭРАЛ, ДОБРА?


Я АДВЯДУ ДЗЯЦЕЙ НАЗАД У ТРЭЙЛЕР, ПАКУЛЬ ВЫ, РАБЯТЫ, ТУТ НЕ СКОНЧЫЦЕ.


ВЫДАТНАЯ ІДЭЯ.
БЫЛО Б ДОБРА, КАБ УСЕ ПАДРЫХТАВАЛІ СВАЮ ЗБРОЮ.


ПАКУЛЬ УСЁ ДОБРА.


А Ў ІХ ТУТ ВЯЛІКІ ДВОР.


ГЭТА МЕСЦА ВЫГЛЯДАЕ ПУСТЫМ.


Я НЯ ВЕДАЮ, КАЛІ АНДРЭА ВЫЙДЗЕ З ГЭТАГА СТАНОВІШЧА. ЯНА ПРОСТА СЯДЗІЦЬ УВЕСЬ ЧАС І ДЭПРЭСУЕ.
Я ХВАЛЮЮСЯ ЗА ЯЕ.


ГЭТЫ ДОМ ПУСТЫ.
ШТО Ў ВАС, РАБЯТЫ? УСЁ ЧЫСТА?
НІБЫТА ТАК. Я НЕ БАЧЫЎ НІКОГА НІДЗЕ ПАБЛІЗУ.
ДОБРА. НЯ ВЕДАЮ, ЯК ВЫ, АЛЕ Я НЕ ХАЧУ ПРАВЕСЦІ ЯШЧЭ НОЧ СПАКАВАНЫМ У ТРЭЙЛЕРЫ. ШТО СКАЖАЦЕ НАКОНТ ТАГО, КАБ УЗЯЦЬ НАШЫЯ РЭЧЫ І ЎВАЛІЦЦА Ў АДЗІН З ГЭТЫХ ДАМОЎ НА НАЧ?
ВОКНЫ НА ДРУГІМ ПАВЕРСЕ Ў ГЭТЫМ ДОМЕ БЫЦЦАМ У ПАРАДКУ. ТАМ ПАВІННА БЫЦЬ ДАСТАТКОВА ЦЁПЛА. ЗАЎТРА МЫ МОЖАМ ПАЧАЦЬ ЧЫСЦІЦЬ АСТАТНІЯ ДАМЫ, І Ў КОЖНАГА З НАС БУДЗЕ ЎЛАСНАЕ МЕСЦА ДЛЯ ЖЫЛЛЯ.
НЯДРЭННАЯ ІДЭЯ.
ДОБРА, ДАВАЙЦЕ ЗАБЯРОМ АСТАТНІХ І БУДЗЕМ РАЗМЯШЧАЦЦА.



ТАЙРЫС І Я АГЛЕДЗІМ ДОМ. УСЕ ЗАСТАВАЙЦЕСЯ ТУТ, ПАКУЛЬ МЫ НЕ ВЕРНЕМСЯ.

Я ПАГЛЯДЖУ НАВЕРСЕ.
УБАЧЫШ ШТО-НЕБУДЗЬ - КРЫЧЫ.
ГЛЕДЗЯЧЫ ШТО Я ЎБАЧУ... У МЯНЕ МОЖА І НЕ БУДЗЕ АСАБЛІВАГА ВЫБАРУ.



ТУТ, ЗДАЕЦЦА, СКЛЕП! ГЭТЫЯ ДАМЫ БОЛЬШ, ЧЫМ ЗДАЮЦЦА.

ХАНГ!

ЯЎЎЎ!!!

ХАЛЕРА!


ЧОРТ!
ЧОРТ!
ЧОРТ!


SLUKK!
ХАЛЕРА ЦЯБЕ БЯРЫ!


ШНUMP!
УФФ!


ДЭЙЛ?! ГЛЕН?! ВЫ МНЕ КРЫХУ НЕ ДАПАМОЖАЦЕ?!


ТРЫМАЙСЯ, РЫК!


ПАДЫМІ ЯГО ГАЛАВУ ДА НЕБА, КАБ Я МОГ СТРЭЛІЦЬ!


FWUMP!


THUD!
Я ПРЫКРЫЮ ЦЯБЕ, ПРЫЯЦЕЛЬ!


ДАВАЙ ПРЫБ'ЕМ ГЭТЫХ ЕЛДАСМАКАЎ!


БУДУ РАДЫ!


SHUNK!


WHAM! WHAM! WHAM! WHAM!


WHACK! WHACK! WHACK!

МЫ Ў ПАРАДКУ?
ЦЯПЕР ТАК.
ТРЭБА АЧЫСЦІЦЬ СКЛЕП. ГЛЕН, БЯРЫ СВОЙ ЛІХТАР.
ПРЫСЛУХАЙСЯ, ПЕРАД ТЫМ, ЯК НЕШТА ЎБАЧЫЦЬ, МЫ НАПЭЎНА СПАЧАТКУ ПАЧУЕМ ШТОСЬЦІ.
КААААААХ.
ТАЙРЫС, ЁСЦЬ АДЗІН!
ІДУ!
WHAM!
ЗДАЕЦЦА, БОЛЬШ НІКОГА.
НАВЕРСЕ ЎСЁ ДОБРА?
ТАК, Я АМАЛЬ СКОНЧЫЎ, КАЛІ ПАЧУЎ ТВОЙ КРЫК... ЗДАЕЦЦА, СКЛЕП ЧЫСТЫ.















*НФЛ – НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ФУТБОЛЬНАЯ ЛІГА. АМЕРЫКАНСКІ ФУТБОЛ. **БАРНІ ФАЙФ – ВЫДУМАНЫ ШЭРЫФ З ТВ-СЕРЫЯЛУ "ШОЎ ЭНДЗІ ГРЫФІТА".


ЛІЧУ, ЗАЎТРА МЫ ЗНОЙДЗЕМ ІХ ЯШЧЭ, КАЛІ АБШУКАЕМ АСТАТНІЯ ДАМЫ. ЯК НАБЯРОМ ВЯЛІКУЮ КУЧУ – СПАЛІМ... МЫ ЎЖО НАДЫХАЛІСЯ ГЭТЫМ СМУРОДАМ. МЯНЕ АД ЯГО ВАНІТУЕ. ТАКІМ ЧЫНАМ, ПАЧАКАЕМ ДЗЕНЬ І СПАЛІМ ІХ УСІХ РАЗАМ.
ТУТ УСЁ ЗАБІТА КАНСЕРВАНІ.
ЁСЦЬ ГРУШЫ?

ГРУШЫ, ЯБЛЫКІ, АНАНАСЫ, ПЕРСІКІ, ВІШНІ... КАЛІ БЫВАЕ КАНСЕРВІРАВАНЫ ВІНАГРАД, ЁН І ТУТ ЁСЦЬ.
З ТАКІМ ЗАПАСАМ, МОЖНА ДУМАЦЬ, ЯНЫ ВЕДАЛІ, ЧАГО ЧАКАЦЬ.

РАДЫ ГЭТА ЧУЦЬ. КАЛІ Я ЎБАЧЫЎ РАЗБІТЫЯ ВОКНЫ, Я ПАЧАЎ ХВАЛЯВАЦЦА. АЛЕ МАРАДЗЁРСТВА ПАВІННА БЫЛО БЫЦЬ РАНЕЙ, КАЛІ ЛЮДЗІ КРАЛІ ТЭЛЕВІЗАРЫ, ВІДЭА І КАМПУТАРЫ. ДА ТАГО ЧАСУ, КАЛІ КАНСЕРВЫ СТАЛІ БОЛЬШ ПАТРЭБНЫМІ, УСЕ, ВІДАЦЬ, УЖО ЗБЕГЛІ Ў АТЛАНТУ.
НАМ ПАШАНСІЛА.

ДОБРА, УЖО ПОЗНА, І Я З НЕЦЯРПЕННЕМ ЧАКАЮ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ, КАБ ПАЧАЦЬ АБШУКВАЦЬ ГЭТАЕ МЕСЦА. ПРАПАНУЮ ЗАВАЛІЦЦА СПАЦЬ. БУДЗЕ БЯСПЕЧНЕЙ, КАЛІ ЎСЕ ЛЯЖАМ НАВЕРСЕ. КАЛІ ХТОСЬЦІ БУДЗЕ ПАДЫМАЦЦА ДА НАС, МЫ ПАЧУЕМ. ДА ТАГО Ж, ГЭТА ЗНАЧНА ЗАПАВОЛІЦЬ ІХ.
У НАС ЧАТЫРЫ ПАКОІ І ВАННАЯ НАВЕРСЕ. Я ВЕДАЮ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ Б СПАЦЬ ТОЛЬКІ СА СВАІМІ СЕМ'ЯМІ, АЛЕ СЁННЯ НОЧЧУ ПРЫЙДЗЕЦЦА КАМУСЬЦІ СПАЦЬ У АДНЫМ ЛОЖКУ. ДОБРААХВОТНІКІ ЁСЦЬ?

Я ЛЯГУ Ў ВАННАЙ. Я СПАЎ У ВАННАЙ, КАЛІ ВУЧЫЎСЯ Ў КАЛЕДЖЫ. ДЛЯ МЯНЕ ГЭТА БУДЗЕ НЕ ПРАБЛЕМА.

САФІЯ І Я МОЖАМ ЛЕГЦІ Ў АДНЫМ ПАКОІ З ТАЙРЫСАМ, ДЖУЛІ І КРЫСАМ.

ХЕХ.
НУ ВОСЬ І ДОБРА. ДАВАЙЦЕ ВОЗЬМЕМ КОЎДРЫ І АДПАЧНЕМ.
THAP!

ХУТКА ЗАСНУЎ... ДОБРА... ЁН НЕ ВЫСЫПАЎСЯ Ў ТРЭЙЛЕРЫ.
ТАК, У ТРЭЙЛЕРЫ БЫЛО ЦЯПЛЕЙ СА СВАІМ НАТОЎПАМ УНУТРЫ, АЛЕ Я НЕ ДУМАЮ, ШТО ТАМ БЫЛО ЎТУЛЬНА СПАЦЬ. І ГЭТЫ ШУМ... БОЖА, УВЕСЬ ЧАС НЕХТА ПАВАРОЧВАЕЦЦА, КЕРХАЕ АБО ПРОСТА ПРАЧЫНАЕЦЦА АД КАШМАРУ.
І ПАХІ. НЕ ЗАБЫВАЙ ПРА ПАХІ...
ЗДАЕЦЦА, ШТО ЗАРАЗ УСЁ БЛІЗКА ДА КАНЦА. БОЖА, Я НЕ МАГУ ПАВЕРЫЦЬ, ШТО МЫ СПІМ У ЛОЖКУ. Я ЎЖО ЗАБЫЎ, ЯК ГЭТА.
ШТО БУДЗЕМ РАБІЦЬ, РЫК?
НУ, Я ДУМАЮ, ШТО Ў МЯНЕ ЁСЦЬ ВОСЕМ МЕСЯЦАЎ, КАБ ЗНАЙСЦІ ДОКТАРА ДЛЯ ЦЯБЕ. КАЛІ МЫ ТРЫВАЛА ЎСТАЛЮЕМСЯ ТУТ, Я ПАСПРАБУЮ ЯШЧЭ РАЗ ПРАЕХАЦЦА ПА ДАРОЗЕ.
ТЫ ЗАЎСЁДЫ ЖАДАЛА ЯШЧЭ ДЗІЦЯ, ПЕРАД ТЫМ, ЯК КАРЛ ВЫРАСЦЕ. Я ДУМАЮ, ШТО РАЗ УЖО ГЭТА ЗДАРЫЛАСЯ, ЗНАЧЫЦЬ, ЧАС ПРЫЙШОЎ. ТЫМ НЕ МЕНШ, ГЭТА НЕ ПАТРЭБНАЕ УСКЛАДНЕННЕ.
УСЁ БУДЗЕ ДОБРА, МІЛАЯ. НЕ ТУРБУЙСЯ.
Я ВЕДАЮ, РЫК. Я ТАК САМА ХВАЛЮЮСЯ, АЛЕ ЗАРАЗ У НАС З'ЯВІЛАСЯ ГЭТАЕ НОВАЕ МЕСЦА... Я АДЧУВАЮ СЯБЕ БОЛЬШ ЎПЭЎНЕННА.
ПРОСТА...
Я ТУТ ПАРЫЛАСЯ Ў НАШАЙ ШАФЕ І ЗНАЙШЛА ЯШЧЭ КОЎДРЫ. ВАМ, РАБЯТЫ, ТРЭБА ЯШЧЭ АДНО?
КАНЕШНЕ, ДОНА, ДЗЯКУЙ.

ДАБРАНАЧ.

О, ТАЙРЫС... ЭЙ, Я ЗНАЙШЛА КОЎДРЫ Ў ШАФЕ. ТУТ ХОПІЦЬ КОЖНАМУ ЯШЧЭ ПА АДНОЙ.

БЯРЫ ТРЫ. ДАЙ АДНО КЭРАЛ І САФІІ. ЦІ НЕ МОГ БЫ ТЫ АДНЕСЦІ ТРЭЦЦЯЕ Ў ВАННУЮ ДЛЯ ГЛЕНА?

КАНЕШНЕ, НЯМА ПРАБЛЕМАЎ, ДОНА, І ДЗЯКУЙ.

ГЭЙ, ТАЙРЫС. Я Е ДУМАЮ, ШТО Ў МЯНЕ БЫЎ ШАНЕЦ ЦЯБЕ ЗАВІТАЦЬ У НАШАЙ СУПОЛКЕ. Я ВЕЛЬМІ РАДА, ШТО ТЫ ДАЛУЧЫЎСЯ. ТЫ ВЕЛЬМІ НАМ ДАПАМАГАЕШ, І ДЖУЛІ ВЕЛЬМІ МІЛАЯ ДЗЯЎЧЫНКА.

ДЗЯКУЙ ЗА ДОБРЫЯ СЛОВЫ. НАМ САПРАЎДЫ ПАШАНСІЛА, ШТО МЫ ЗНАЙШЛІ ТАКІХ ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ. АСАБЛІВА Ў НАШЫМ СТАНОВІШЧЫ... МЫ БЫЛІ БЕЗ ЕЖЫ, БЕЗ СХОВІШЧА... МЫ НАПЭЎНА, НЕ ВЫЖЫЛІ Б, КАЛІ Б НЕ СУСТРЭЛІ ВАС ТОЙ НОЧЧУ.

Я ВЕЛЬМІ ЎДЗЯЧНЫ ЎСІМ ВАМ. ВЫ ЗАЎСЁДЫ МОЖАЦЕ РАЗЛІЧВАЦЬ НА МЯНЕ.

ДАБРАНАЧ, ДОНА.

ДАБРАНАЧ, ТАЙРЫС. ДОБРАГА СНА.

ДЭЙЛ?

АНДРЭА?

Я ТУТ ЗНАЙШЛА...

...


click.




АНДРЭА Ў ПАРАДКУ.
А? ШТО?


Я ХАЦЕЛА ДАЦЬ ІМ КОЎДРУ І ЎБАЧЫЛА ІХ... РАЗАМ... ТАКІМ ЧЫНАМ, У НАС З'ЯВІЛАСЯ ДАДАТКОВАЯ КОЎДРА.
Я НЕ АДВАЖЫЛАСЯ ІХ СПЫНІЦЬ.


САПРАЎДЫ? УАЎ. НУ ЗНАЧЫЦЬ, НАМ ПАШАНСІЛА?
Я ДУМАЮ, ЯНО ІМ НЕ ТРЭБА... У ІХ ЗАРАЗ ЗАЛІШНЕ ЦЯПЛА.



ТЫ ВЕДАЕШ... Я ЎСЁ ЯШЧЭ НЕ ЎХВАЛЯЮ ГЭТЫХ АБОДВУХ, АЛЕ АНДРЭА ДАРОСЛАЯ ЖАНЧЫНА І ЯНА МОЖА ВЫРАШАЦЬ ЗА СЯБЕ САМАСТОЙНА. ПРОСТА ПРЫЕМНА БАЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ ШЧАСЛІВЫМІ СЯРОД УСЯГО, ШТО АДБЫВАЕЦЦА...
Я ШЧАСЛІВА ЗА ІХ.


СНЕЖНАЯ КАРАЛЕВА РАСТАЕ.
О, ЦІШЭЙ.


ДАРЭЧЫ, Я ДУМАЮ, НА ВУЛІЦЫ ПАЦЯПЛЕЛА. СНЕГ РАСТАЕ НА ВОКНАХ.







ESTATES
ХЛОП


ХЛОП


ХЛОП


УСЕ
МЁРТВЫЯ
НЕ
ЎВАХОДЗІЦЬ
ХЛОП


УСЕ
МЁРТВЫЯ.
НЕ
ЎВАХОДЗІЦЬ










THE WALKING DEAD™











ХАДЗЯЧЫЯ МЕРЦВЯКІ
ПЕРАКЛАД НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ: COMICSBY І АЛЕНА ВАСІЛЬКОВА
COMICSBY.UCOZ.COM, VK.COM/COMICS_BY